*УДК 378.637:378.14*

***І.І. Цыркун***

# ІНАВАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У ПЕДАГАГІЧНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ ЯК ФАКТАР РАЗВІЦЦЯ СІСТЭМЫ ПЕДАГАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

Па ініцыятыве рэктарата Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка калектывам універсітэта сумесна з Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь была распрацавана Канцэпцыя развіцця педагагічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і Праграма рэалізацыі Канцэпцыі развіцця педагагічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Гэтыя дакументы падвергліся комплекснай экспертызе, былі ўхвалены Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь (пастанова № 527 ад 18 красавіка 2000 г.) і зацверджаны 25 кастрычніка 2000 г. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь (пастанова № 47).

Прайшло два гады, і ўзнікла неабходнасць абмеркаваць ход выканання Праграмы рэалізацыі Канцэпцыі развіцця педагагічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь на пашыраным пасяджэнні савета універсітэта з удзелам прадстаўнікоў іншых ВНУ.

Актуальнасць абмяркоўваемай праблемы абумоўлена таксама новым Палажэннем аб ступенях вышэйшай адукацыі, зацверджаным Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь 14 кастрычніка 2002 г. (пастанова № 1419).

Распрацаваная Праграма прадугледжвала стварэнне навукова-арганізацыйных асноў і механізмаў далейшага развіцця педагагічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь у новых сацыяльна-эканамічных умовах і ўдасканаленне сістэмы падрыхтоўкі педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі. У Праграме вызначаны наступныя прыярытэтныя задачы развіцця педагагічнай адукацыі на перыяд да 2010 г.:

- удасканаленне зместу адукацыі і арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу;
- умацаванне сувязі педагагічнай адукацыі з фундаментальнай і прыкладной навукай;
- удасканаленне структуры падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі спецыялістаў;
- фарміраванне шматузроўневай сістэмы бесперапыннай педагагічнай адукацыі, аптымізацыя сістэмы ўстаноў педагапчнай адукацыі;
- удасканаленне сістэмы кіравання педагагічнай адукацыяй;
- фінансавае і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне праводзімых пераўтварэнняў;
- забеспячэнне сацыяльнай падтрымкі студэнтаў, павышэнне прэстыжу педагагічнай працы.

Сукупнасць сфарміраваных задач, а таксама вызначэнне сродкаў іх рашэння сталі асновай мадэлі праекта неабходнага будучага сістэмы.

Распрацаваны комплекс мерапрыемстваў практычных крокаў па рэалізацыі Праграмы праект мадэлі развіцця сістэмы і план (канкрэтны праект) развіцця сістэмы на ўзроўні педагагічнага універсітэта. Вылучаюцца некалькі ўзроўняў, на якіх здзяйснялася рэалізацыя Праграмы развіцця: Міністэрства; усе навучальныя ўстановы рэспублікі з педагагічнай накіраванасцю; педагагічны універсітэт у цэлым, факультэты і агульнауніверсітэцкія кафедры; правядзенне даследаванняў. Разгледзім больш дэтальна задачы, якія вырашаліся на ўзроўні універсітэта, факультэтаў і агульнауніверсітэцкіх кафедраў, даследаванняў у гэтай галіне.

На **ўзроўні педагагічнага універсітэта** дасягнуты ў цэлым істотныя колькасныя і якасны рэзультаты па выкананні Праграмы развіцця.

У 2002 г. на 15 факультэтах здзяйснялася падрыхтоўка па 52 спецыяльнасцях каля 17тыс. студэнтаў. Для параўнання: раней рыхтавалі толькі па 16—17 спецыялынасцях Рэал заваны ідэі рэктарата, якія прадстаўлены ў Канцэпцыі і Праграме развіцця педагагічнай адукацыі аб *падрыхтоўцы не проста настаўнікі прадметніка, а спецыялістаў па дзяцінстве,* ў далейшым і ва ўсёй *узроставай перыядызацыі.* Гэта прынцыпова другая якасць, *новы падыход,* што адрознівае наш універсітэт ад іншых вышэйшых навучальных устаноў, якія існуюць свеце, падкрэслівае яго *унікальнасць.*

Увасабленнем гэтага падыходу з'яўляецца. адкрыццё новых спецыялынасцяў і спецыялізацый: «Дзіцячая і юнацкая журналістыка», «Псіхалогія (псіхалогія сям'і,

РЕПОЗ

псіхалогія асобы, псіхалогія менеджменту і інш.)», «Сацыяльна работа», «Культуралогія», «Валеалогія». Гэта напрамкі падрыхтоўкі спецыялістаў, якіх наогул не было ў Рэспубліцы Беларусь. Пераўтварэнні ва універсітэце здзяйсняюцца на аснове навуковых даследаванняў, створаны і развіваюцца навуковыя школы.

Сёння педагагічны універсітэт — гэта *храм навукі.* Ва універсітэце працуе 980 прафесараў і дацэнтаў, адкрыта сем саветаў па абароне дысертацый (два доктарскіх і пяць кандыдацкіх) па 17 спецыялынасцях. У 2001 г. абаронены 45 дысертацый, апублікаваны 14 манаграфій, 21 падручнік для вышэйшай і сярэдняй школы, 214 вучэбных дапаможнікаў, 972 навуковыя артыкулы.

Сістэма шматузроўневай падрыхтоўкі ўзнікла ў БДПУ каля 10 гадоў назад. За гэты час падрыхтавана 500 бакалаўраў і 300 магістраў. Рэалізуюцца ідэі прафесійнай мабільнасці інавацыйнай адукацыі, арганізацыі самастойнай і даследчыцкай дзейнасці студэнтаў.

Педагапчны універсітэт займае вядучае месца сярод вышэйшых навучальных установ рэспублікі па арганізацыі студэнцкай навуковай працы. У мі-нулым годзе пададзена на конкурс па раздзеле «Педагогіка, тэорыя і методыка выкладання дысцыплін» 111 прац, што складае 54,7 % ад усіх прац па рэспубліцы. 3 іх 81,1 % былі адзначаны І, II і III катэгорыямі.

У адпаведнасці з патрабаваннем Праграмы развіцця ва універсітэце створаны пакет нарматыўных дакументаў, які ўключае агульна-адукацыйныя стандарты па ўсіх спецыяльнасцях, новыя базавыя і тыпавыя вучэбныя праграмы. У лічбах: распрацавана і зацверджана 46 адукацыйных стандартаў, 46 базавых вучэбных планаў, 169 тыпавых вучэбных праграм, 476 базавых вучэбных праграм.

У праект дзяржаўнага класіфікатара ўнесена 80 прапаноў, большасць якіх рэалізаваны. Распрацаваны стандарт магістэрскай падрыхтоўкі. Вызначана новая структура агульнапедагагічнай і псіхалагічнай падрыхтоўкі студэнтаў. Распрацавань адпаведныя тыпавыя і базавыя праграмы. Распрацаваны новыя прапановы аб педагагічных практыках, а таксама праграма камп'ютэрызацыі універсітэта.

Пры БДПУ створаны Інстытут павышэння кваліфікацыі, а таксама сістэма цэнтраў: па праблемах педагагічнай адукацыі; упраўленне каардынацыі дзейнасці навучальных устаноў; упраўленне падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі; цэнтр развіцця Інфармацыйных тэхналогій.

Распрацавана праграма камп'ютэрызацыі бібліятэкі. Створаны Вучэбна-выдавецкі цэнтр БДПУ. Дэталёвы аналіз дасягненняў педагагічнага універсітэта адлюстраваны ў [1].

Пад кіраўніцтвам акадэміка Л. Н. Ціханава праводзілася даследаванне па праблеме рэалізацыі Праграмы развіцця педагагічнай адукацыі. У рамках гэтага даследавання вырашаны наступныя задачы:

- вызначаны канцэптуальныя асновы асобасна-развіццёвага навучання студэнтаў;
- упершыню распрацавана акмеяграма педагога-інаватара як праект-мадэль падрыхтоўкі [2];
- удакладнены абагульняльны тыпалагічны партрэт студэнтаў БДПУ.

**Табліца 1**

**Размеркаванне студэнтаў па тыпах асобы**

| | | | |
|---|---|---|---|
| ISTJ 12,97 | ISFJ 0,84 | INFJ 0,21 | INTJ 6,06 |
| ISTP 2,51 | ISFP 0,21 | INFP 0,63 | INTP 1,26 |
| ESTP 0,84 | ESFP 3,14 | ENFP 6,49 | ENTP 4,18 |
| ESTJ 16,10 | ESFJ 22,59 | ENFJ 19,46 | ENTJ 2,51 |

Аналіз рэзультатаў (табл. 1) пацвердзіў, што сярод студэнтаў універсітэта пераважаюць наступныя тыпы асобы:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ISFJ — 22, 59** % — таварыскія, камунікабельныя, умеюць дакладна арганізаваць сваю працу;

**INFJ — 19,46** % — умеюць уважліва адносіцца да пачуццяў іншых людзей, быць таварыскімі, пераконваць;

**ESTJ — 16,10 %** — валодаюць высокім пачуццём адказнасці, умеюць правільна арганізаваць сваю дзейнасць;

**ISTJ — 12,97** % — арыентаваны на прадуктыўнасць і практычны вынік.

Ажыццёўлены інфармацыйна-колькасны аналіз дысертацый па педагогіцы (пачынаючы з 1999 г. па цяперашні час). Вызначаны тэндэнцыі развіцця педагагічных даследаванняў. Распрацавана Канцэпцыя і Праграма развіцця педагагічнай навукі ў Рэспубліцы Беларусь [3].

Распрацавана таксама праграма рэалізацыі ў педагагічным працэсе сучасных адукацыйных тэхналогій, праект палажэння аб бессесіённай форме навучання студэнтаў, праграма псіхолага-педагагічнай асветы насельніцтва і інш.

Задачы, вызначаныя Праграмай на **факультэтах і агульнауніверсітэцкіх кафедрах,** вырашаліся шляхам распрацоўкі спецыяльнага апытальніка, справаздач кожнай кафедры І фа-культэта аб выкананні Праграмы, аналізу матэрыялаў рэктаратаў і саветаў універсітэта, дзе абмяркоўваліся праблемы развіцця педагагічнай адукацыі.

Ацэнка даных паказала, што на факультэтах і агульнауніверсітэцкіх кафедрах праводзіцца пэўная работа ў кірунку вырашэння задач развіцця сістэмы педагагічнай адукацыі. Адмоўных адносін суб'ектаў да рэалізацыі праграмы не выяўлена. Яна рэалізуецца ў інтэрвале: *індыферэнтныя адносіны да новаўвядзенняў — патрэбнасць у новаўвядзеннях.* што выражаецца колькасна з дапамогай каэфіцыента ўдзелу факультэтаў, кафедраў у рэалізацыі задач развіцця. Значэнне каэфіцыента ўдзелу вагаецца ў межах ад 0,17 да 0,70.

Найбольш моцныя бакі, якія забяспечваюць развіццё факультэтаў, прадстаўлены ў табліць 2, кафедраў — у табліцы 3.

**Табліца 2**

**Прыярытэтныя інавацыйныя напрамкі дзейнасці факультэтаў**

| Факультэт | Змест дзейнасці факультэта |
|---|---|
| Фізічны | Камп'ютэрнае забеспячэнне педагагічнага працэсу, здзяйсненне камп'ютэрнага суправаджэння самастойнай работы студэнтаў. Развіццё фундаментальных даследаванняў па агульнай фізіцы, тэарэтычнай фізіцы і матэматыцы. Эфектыўная арганізацыя педагагічнай практыкі. Дыферэнцыраваны падыход да метадычнай падрыхтоўкі настаўніка фізікі і матэматыкі, фізікі і інфарматыкі. |
| Дашкольнае выхаванне | Распрацаваны вучэбна-метадычныя комплексы, інтэгратыўныя курсы. Адкрыта новая спецыяльнасць «Музычнае мастацтва і харэаграфія» |
| Матэматычны | Прымяняюцца праграмы камп'ютэрнай падтрымкі вучэбных дысцыплін, сучасныя адукацыйныя тэхналогіі (блочнае выкладанне вучэбнага матэрыялу. развіццёвае навучанне і інш.). Адкрыта новая спецыялынасць «Інфарматыка і замежная мова». |
| Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі педагагічных кадраў | Адкрыты ўпершыню. Здзяйсняецца перападрыхтоўка педагагічных кадраў па шасці новых спецыяльнасцях. Рэалізавана сістэма педагагічных тэхналогій і курсаў па выбары. |
| Дэфекталогіі | Распрацавана навукова-метадычнае забеспячэнне кантралюемай самастойнай працы студэнтаў. Распрацаваны і прымяняюцца актыўныя метады і формы навучання, а таксама інтэгратыўныя курсы |

| | |
|---|---|
| Прыродазнаўства | Распрацаваны праграмы камп'ютэрнай падтрымкі вывучэння батанікі, арганічнай і неарганічнай хіміі і інш. Рэалізаваны сувязі педагагічнага працэсу з фундаментальнымі даследаваннямі. Паспяхова развіваюцца міжнародныя сувязі |
| Псіхалогіі | Педагагічны працэс ажыццяўляецца ў рэжыме эксперыментаў. Адпрацоўваюцца асінхронная і крэдытна-рэйтынгавая сістэмы. Распрацавана 12 вучэбна-метадычных комплексаў. Адкрыты цэнтр электроннай кнігі і сайт факультэта. Арганізавана міжнароднае супрацоўніцтва ў навуковай і прафесійнай сферах |
| Народнай культуры | Кафедры факультэта ўкамплектаваны камп'ютэрнай тэхнікай Створаны праграмы камп'ютэрнай падтрымкі вучэбных дысцыплін. Распрацавана навукова-метадычнае забеспячэнне па арганізацыі самастойнай працы студэнтаў |
| Пстарычны | Эфектыўна арганізаваны навуковыя даследаванні. Скла1іся навуковыя школы 94 % выпускнікоў пішуць дыпломныя работы. Арганізавана падрыхтоўка студэнтаў па новай спецыяльнасці «Псторыя і рэлігіязнаўства» |
| Сацыяльнай педагогікі і практычнай псіхалогіі | Прымяняюцца сучасныя адукацыйныя тэхналогіі, а таксама ажыццяўляецца камп' ютэрная падтрымка вывучэння замежнай мовы. Больш за 60 % студэнтаў пішуць дыпломныя працы. Арганізавана міжнароднае супрацоўніцтва ў навуковай і прафесійнай сферах |
| Педагопкі і методыкі пачатковага навучання | Шырока прымяняюцца актыўныя метады і формы навучання. а таксама кантроль арганізацыі самастойнай працы студэнтаў. Распрацаваны інтэгратыўныя курсы. Эфектыўна арганізавана педагагічная практыка. Адкрытг новая спецыяльнасць «Музычнае мастацтва і харэаграфія» |
| Рускай філалогіі | Больш за 60 % студэнтаў пішуць дыпломныя працы. Рэалізаваны ідэі дыстанцыйнага навучання на завочным аддзяленні. Адкрыты сайт факультэта Распрацаваны план падрыхтоўкі кандыдатаў і дактароў навук на 5 гадоў |
| Музычна-педагагічны | Рэалізавана модульна-рэйтынгавая сістэма. Створана вучэбна-метадычнае аб'яднанне (школы, гімназіі, вучылішчы, педагагічны коледж) Сістэмна здзяйсняецца арыентацыя моладзі на педагагічную прафесію |
| Медыцынскі | Адкрыты ўпершыню. Арганізавана падрыхтоўка спецыялістаў: педагог-медсястра, выкладчык медыцынскіх дысцыплін, у тым ліку ў школе |
| Даінстытуцкай падрыхтоўкі і прафесійнай арыентацыі | Прымяняюцца сучасныя адукацыйныя тэхналогіі. Распрацаваны праграмы дыстанцыйнага навучання на завочных падрыхтоўчых курсах па ўсіх прадмет. |
| Беларускай філалогіі і культуры | Адкрыта новая спецыялынасць па дзіцячай і юнацкай журналстыцы. дадатковыя спецыяльнасці па польскай і літоўскай мовах. Створаны кабінет паланістыкі. аснашчаны ТСН. Арганізавана міжнароднае супрацоўніцтва. Рэалізаваны ідэі бесперапыннасці педагагічнай адукацыі |

**Табліца 3**

## Прыярытэтныя інавацыйныя напрамкі дзейнасці агульнауніверсітэцкіх кафедраў

| Кафедра | Змест дзейнасці кафедры |
|---|---|
| Замежных моў | Распрацаваны поўны пакет новых праграмных дакументаў: тыпавыя, базавыя і рабочыя праграмы. Абаронена больш за 30 магістэрскіх дысертацый. Арганізавана стажыроўка выкладчыкаў у ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі і інш Удзел у праграм «Tempus». Выкарыстоўваюцца інтэрнет-рэсурсы, сучасныя тэхнічныя сродкі. Арганізаваны Цэнтр для самастойнага вывучэння замежнай мовы, Падрыхгаваны вучэбныя дапаможнікі для студэнтаў |
| Эканамічнай тэорыі | Распрацавана і выдадзена 5 вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў. Распрацаваны розныя формы арганізацыі самастойнай працы. Распрацавана 6 інтэгратыўных спецкурсаў па праблемах эканамічнай адукацыі і выхавання |
| Педагогікі вышэйшай школы і сучасных выхаваўчых тэхналогій | Прымяняюцца ў вучэбным працэсе сучасныя адукацыйныя тэхналогіі: рэйтынгавая сістэма, праграміраванае навучанне, модульнае навучанне, інтэгратыўнае навучанне і інш. Распрацаваны інтэгратыўныя курсы, напісаны і выдадзены дапаможнікі па педагогіцы |
| Айчычнай і сусветнай гісторыі | Падрыхтаваны 3 вучэбна-метадычныя комплексы, арганізаваны заняткі студэнтаў у праблемных групах. На Рэспубліканскі конкурс падрыхтавана 15 навуковых прац студэнтаў. Кафедра прымае ўдзел у распрацоўцы мэтавых праектаў |
| Філасофіі | Распрацавана канцэпцыя «Грамадазнаўства ў сістэме бесперапыннай педагагічнай адукацыі», перагледжаны склад і структура вывучэння грамадскіх дысцыплін. Распрацаваны і выдадзены вучэбныя дапаможнікі для арганізацыі самастойнай працы студэнтаў |
| Паліталогіі і права | Арганізаваны 12 праблемных груп. Распрацавана сістэма спецкурсаў. Арганіза палітычная асвета студэнтаў. Студэнты ўдзельнічаюць у навуковых даследаваннях, падрыхтавана 15 дыпломных прац. Распрацаваны і выдадзены 10 вучэбных дапаможнікаў, якія прымяняюцца пры арганізацыі самастойнай працы студэнтаў |
| Беларускай мовы і методыкі яе выкладання | Падрыхтаваны 42 дыпломныя працы. Ствараецца сістэма дыстанцыйнага навучання студэнтаў-завочнікаў |
| Фізічнага выхавання | Арганізавана кантралюемая самастойная праца. Распрацаваны дапаможнікі для студэнтаў. Здзяйсняецца мэтанакіраваная праца па прафесійнай арыентацыі моладзі для паступлення ў педагагічны універсітэт |
| Псіхалогіі | Перагледжаны склад і структура вывучэння псіхалагічных дысцыплін, падрыхтавана новая базавая праграма па псіхалогіі. Прымяняюцца кінаматэрыялы і відэаматэрыялы, праграміраваныя апытальнікі, задачы з практычным зместам |
| Тэхнічных сродкаў навучання | Распрацаваны 4 тыпавыя і *2* базавыя праграмы. Падрыхтаваны і выдадзены вучэбныя дапаможнікі. Завяршаецца стварэнне вучэбна-метадычных комплексаў. Кафедра прымае актыўны ўдзел у рэалізацыі Праграмы інфарматызацыі універсітэта |

| | |
|---|---|
| Педагогікі | Вызначана новая структура агульнапедагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў. Падрыхтавана і выдадзена тыпавая праграма. Адкрыта магістратура па педагогіцы. Падрыхтаваны 4 кандыдаты навук. Распрацаваны Праграма выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь, Канцэпцыя і Праграма развіцця педагагічнай навукі, навукова-метадычны комплекс па рэалізацыі кантралюемай самастойнай работы студэнтаў. Выконваюцца фундаментальныя і прыкладныя даследаванні |

Прадстаўпеныя ў табліцах 2 і 3 прыярытэтныя інавацыйныя напрамкі дзейнасці факультэтаў і агульнауніверсітэцкіх кафедраў не выключаюць праблем у рэалізацыі задач развіцця сістэмы педагагічнай адукацыі. На рыс. 1 прыведзена значэнне каэфіцыента, які адлюстроўвае ступень удзелу факультэтаў і кафедраў у некаторых напрамках дзейнасці, вызначаных задачамі развіцця.




**Кірункі дзейнасці**

**Рыс.1. Удзел факультэтаў і агульна адукацыйных кафедраў у рэалізацыі задач развіцця педагагічнай адукацыі**

Аналіз рэзультатаў (рыс.1) паказаў наступнае. Вырашэнне задачы, звязанай з распрацоўкай вучэбна-метадычных комплексаў для арганізацыі самастойнай работы студэнтаў, пазітыўна ўспрымаецца суб'ектамі развіцця і дастаткова паспяхова здзяйсняецца на факультэтах (К=0,50) і агульнауніверсітэцкіх кафедрах (К=0,73). Іншыя напрамкі развіцця рэалізуюцца не ў поўнай меры, значэнне каэфіцыента ўдзелу для іх з'яўляецца невысокім (0,06:0,27). Адзначым, што на факультэтах больш накіравана здзяйсняюць рэалізацыю сучасных адукацыйных тэхналогій (К=0,56) у параўнанні з агульнауніверсітэцкімі кафедрамі (К=0,27).

Аналіз усёй сукупнасці даных дазволіў сфарміраваць вывад аб тым, што ў рэалізацыі задач развіцця факультэтам і кафедрам неабходна пераходзіць ад рашэння адзінкавых задач да комплекснага іх вырашэння, узаемаабагачаць дзейнасць ідэямі прагрэсіўнага вопыту калег.

агульнауніверсітэцкіх кафедраў у рэалізацыі задач развіцця педагагічнай адукацыі

Неабходна інтэнсіфікаваць:

- развіццё электроннай адукацыі, якая з'яўляецца адной з крытычных тэхналогій XXI ст.;
- асэнсаванне таго, што педагагічная дзейнасць з'яўляецца навўкаёмістай і яе эфектыўнасць абумоўлена прымяненнем адэкватна пастаўленай педагагічнай мэты адукацыйнай тэхналогіі;
- актуалізацыю праблемы далейшай распрацоўкі навукова-метадычнага забеспячэння рацыянальнай арганізацыі самастойнай працы студэнтаў, паступовага пераходу да асінхроннай мадэлі арганізацыі педагагічнага працэсу і бессесіённай формы атэстацыі;
- развіццё міжнароднага супрацоўніцтва;
- распрацоўку пакета дакументаў новага пакалення для розных стўпеняў вышэйшай педагагічнай адукацыі з абавязковым улікам яго спецыфікі. асаблівасцяў прадмета працы і тыпу прафесій «чалавек — чалавек», што з'яўляюцца прыярытэтнымі;
- ў 2003/04 навўчальным годзе вырашзнне задач Праграмы. звязаных з удасканаленнем сістэмы кіравання, фінансавым і матэрыяльна-тзхнічным забеспячэннем, сацыяльнай падтрымкай студэнтаў і выкладчыкаў.

Аб'ектыўныя складанасці ва ўвасабленні ідэй Праграмы на практыцы заключаюцца ў:

- адсўтнасці яе спецыяльнага фінансавання;
- ўзнікненні неадпаведнасці, у прыватнасці паміж: патрабаваннем павышэння якасці падрыхтоўкі і паралельным павелічэннем колькасці стўдэнтаў на выкладчыка; неабходнасцю здзяйсняць камп'ютэрызацыю фінансавымі магчымасцямі навучальнай установы і інш.

Мэтазгодна таксама ўлічваць заканамернасці развіцця інавацыйнага працэсу. У інаватыцы вызначаны фактары, якія садзейнічаюць прагрэсіўным пераўтварэнням: павелічэнню заработнай платы; расшырэнню правоў; паляпшэнню магчымасцяў для удасканалення і павелічэння шансаў на будучае; цікавая, менш стамляльная і больш важная праца ў лепшых умовах і інш.

Улік гэтых фактараў забяспечыць стварэнне спрыяльнага інавацыйнага клімату, што з'яўляецца адной з прадпасылак інтэнсіфікацыі пераўтварэнняў.

*ЛІТАРАТУРА*


1. Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка: гісторыя і сучаснасць (1922-2002 гг.). Мн., 2002.
2. *Цыркун И.И.* Система инновационной подготовки специалистов гуманитарной сферы. Мн., 2000.
3. *Цыркун И. И.* Проблемы развития педагогической науки в Беларуси: концептуальное обоснование и проектно-программные орнентнры // Адукацыя і выхаванне.2002. № 8 С. 51—58.


РЕПОЗИТОРИЙ